# Рыхтуецца пляцоўка для будаўніцтва ў сталіцы новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі

**Сталічныя ўлады прынялі рашэнне аб зносе 12 жылых дамоў, размешчаных у 4-м Сляпянскім завулку. Вельмі хутка на гэтым месцы будзе вялікая будаўнічая пляцоўка.**

Менавіта тут, каля сталічнай станцыі метро «Усход», на перакрыжаванні праспекта Францыска Скарыны і вуліцы Філімонава, плануецца ўзвесці новы будынак Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Жыльцам гэтых дамоў выдзелена 2500 квадратных метраў жылля, паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў камітэце па архітэктуры, горадабудаўніцтву і землеўпарадкаванню Мінгарвыканкама.

Як расказала карэспандэнту БЕЛТА дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Галіна Алейнік, па плану агульная плошча новага будынка — 85 тысяч квадратных метраў. Пад кнігасховішча будуць аддадзены 22 паверхі. Тут змогуць размясціцца больш як 10 мільёнаў кніг і іншай друкаванай прадукцыі. Само кнігасховішча, па задуме архітэктараў, уяўляе сабой гіганцкі шматгранны крышталь — як сімвал накопленых ведаў, якія вяртаюцца чалавецтву. У новым будынку размесцяцца таксама чытальныя залы, даведачна-інфармацыйная служба, канферэнц-зала, прасторныя холы.

Менавіта такая канструкцыя будынка бібліятэкі (вертыкальнае кнігасховішча і гарызантальная рабочая зона) дае магчымасць да мінімуму скараціць шлях дастаўкі кнігі да чытача. Новы бібліятэчны комплекс разлічаны на 1800 пасадачных месцаў, што ўдвая больш, чым у старым будынку. Мяркуецца, што кожны дзень яго паслугамі змогуць карыстацца амаль 4 тысячы чалавек.

Нагадаем, што ўзвядзенне новага будынка Нацыянальнай бібліятэкі прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка аб'явіў агульнанацыянальнай будоўляй, якую будуць весці на працягу бліжэйшых чатырох гадоў, што называецца, «усёй грамадой».

**Аксана АСПІШЧАВА, БЕЛТА.**